**УДК 801.561.26**

**Б. А. Крук (Мазыр, Беларусь)**

# БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ І ТЭКСТ

*У артыкуле аналізуецца выкарыстанне бяззлучнікавых складаных сказаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове, адзначаецца частотнасць ужывання і акцэнтуецца ўвага на іх узаемадзеянне з іншымі сказамі і кантэкстам.*

Сінтаксіс заўсёды быў аб’ектам увагі лінгвістаў, асабліва складаны сказ. У тэорыі складанага сказа найбольш спрэчак выклікаў бяззлучнікавы сказ, які характарызуецца якаснай неаднароднасцю. Гэта штурхала даследчыкаў да пошуку новых канцэпцый апісання бяззлучнікавых сказаў. Дыскусійных, супярэчлівых і нераспрацаваных пытанняў у тэорыі бяззлучнікавага складанага сказа яшчэ шмат. Адно з такіх – спрэчка лінгвістаў аб межах простага і бяззлучнікавага складанага сказаў, а таксама між бяззлучнікавым сказам і тэкстам.

Вядома, што вывучэнне сінтаксісу твора дапамагае не толькі раскрыць яго форму, але і садзейнічае пранікненню ў яго ідэю. І тут, відаць, справа не столькі ў сказе (сказах), што выкарыстоўвае аўтар, колькі ў тым сэнсе, які гэтым сказам (моўным эпізодам) адлюстроўваецца ў кожным канкрэтным выпадку. Намі зафіксаваны прыклады, калі кантэкст складаецца толькі з бяззлучнікавых складаных сказаў, а таксама кантэксты дзе прэваліруюць бяззлучнікавыя складаныя сказы: *Колецца ў ногі: на сцежцы жвір і вострыя каменьчыкі – увесь дзень да вечара шалеў вецер, павыдзімаў пясок. Алёшка не баіцца гэтага: усю вайну, усе тры гады, ад снегу да снегу – босы* (І. Пташнікаў. Алёшка). *Прайшлі цёплыя дажджы, сонца дорыць зямлі невычарпальную ласку ў святле і цеплыні. Увачавідкі змяняецца выгляд палёў, фарбы бурлівага росквіту залілі іх. Красуе жыта, раніцай празрысты туман квецені ўстае над ім, гойдаецца ў павевах ветрыку* (Т. Хадкевіч. Даль палявая). *Доўга блукаючы па лесе, восень я ўяўляў прыгажуняй з жоўтымі косамі, у вогненна-жоўтай сукенцы, вочы – задумлівая сінь неба. Ад гэтай чараўніцы ва ўсе бакі льецца мяккае святло: бірузовае – ад вачэй, залатое і бардовае – ад убораў. Ад гэтага святла мяняецца лес: ліпа – жаўцее, брызгліна – ружавее, рабіна становіцца пунсовай, асіна – чырвонай і аранжавай, бэз – бронзавым, бяроза – залацістай. Узмахнула восень правай рукой – зацвілі ў нізінных месцах лугавыя васількі, плакун-трава, казяльцы. Махнула яна левай рукой – зацвілі каля дарог нівянікі, торбачнікі, браткі, дзьмухаўцы, стрэлкі. Узмахнула зноў восень правым узорыстым рукавом – заізумрудзілася рунь, цяжкія гронкі рабін прыгнулі долу галінкі* (”Маладосць”). *Адзвінелі, адгаманілі, збягаючы з пагоркаў, шпаркія ручаі, заліліся звонкім срэбрам жаўрукі ў паднябессі, прыгрэла сонца, у нізінах мякка закучаравілася трава, пракінуліся залатыя вочкі кураслепу, зазвінела жоўтымі галоўкамі маці-мачыха. Вербалоз над канавамі і стаўкамі аздобіўся пушыстымі коцікамі, пацямнелі рослыя бярозы каля гасцінца, павіслі на іх голлі жаўтлявыя завушнічкі. Вясна ўсё больш бралася ў сілу. Хутка завушніцы на бярозах патанулі ў пяшчотнай зяляніне лісткоў, набрынялі пупышкамі сады, гатовыя не сёння-заўтра ўспалыхнуць кіпучай замяццю квецені, белым полымем загарэўся на ўзлессях чаромхавы цвет* (Т. Хадкевіч. Песня Дзвіны).

Фармальна простыя сказы могуць уваходзіць у склад бяззлучнікавага складанага сказа, а з іх у сваю чаргу можна выдзяліць пэўныя прэдыкатыўныя часткі ў асобныя сказы. Гэта не пярэчыць і поглядам як на складаны сказ, так і на тэкст аўтараў “Синтаксиса современного русского языка”, якія адзначаюць, што часам паміж складаным сказам і тэкстам няма дакладнай мяжы. Гэта асабліва адносіцца, падкрэсліваюць аўтары названага дапаможніка, да бяззлучнікавых складаных сказаў з пералічальнымі адносінамі паміж часткамі, дзе немагчыма вызначыць, з якімі сказамі мы маем справу [1, 202]. Для ўзору спашлемся на прыклады: 1. *Але вось дні пацяплелі, выкаласілася жыта, вывеліся маладыя шпакі, густа зацвіў чабор на пясчаных узгорках, трава на заліўных лугах паднялася ў пояс, бульба зацвіла, запахла ўсюды сырадоем, цёплай зямлёй, агуркамі.* ***Колькі багацця адразу зацвіло і забуяла на зямлі!*** (М. Лупсякоў. Прырэчча). 2. *Вось шэлест ветру прабег над пакосамі, недзе камар ціха струны наладжвае, звон падала свой пчала, пралятаючы. Ёй адказала асвянка сварлівая, хрушч у літаўры шарахнуў мядзяныя, чмель загудзеў, чмялянят аклікаючы, застракаталі бяссонныя конікі.* ***Колькі ў адной копцы сена музыкі радаснай*** (М. Танк. Канцэрт у сене).

У прыведзеных двух прыкладах эмацыянальная ацэнка зместу даецца ў апошнім сказе. Ён змяшчае актуальную інфармацыю, у якой перадаюцца адносіны аўтара да папярэдняга зместу. Такія сказы, як паказвае даследаваны матэрыял, актыўна выкарыстоўваецца ў мове мастацкай літаратуры прыродаапісальнага характару. З прыведзеных прыкладаў відаць, што аб’ёмнасць апісання дасягаецца шляхам выкарыстання бяззлучнікавых складаных сказаў з пералічальнымі адносінамі. Інтанацыйна-сэнсавую завершанасць выказванне набывае ў шырокім кантэксце. Толькі ў такім кантэксце магчыма яго актуалізацыя і правільная сэнсавая трактоўка. Значэнне асобных бяззлучнікавых складаных сказаў і сэнс выказвання звязаны між сабою непарыўна як розныя ўзроўні адзінага цэлага.

У апавядальным мастацкім тэксце і ў публіцыстыцы нярэдка сустракаюцца бяззлучнікавыя складаныя сказы, узнаўленне якіх у поўным аб’ёме магчыма толькі з шырокага кантэксту: 1. *На сёмыя ці восьмыя суткі Мацвей з каровамі быў ужо каля пераправы цераз Бярэзіну.* ***Не падганяў блізка – бамбілі*** (М. Лобан.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Шэметы). Параўн.: *Мацвей не падганяў кароў блізка да пераправы – немцы яе бамбілі.* 2. *Лагуцін накіроўваў тройку за тройкай. Уперадзе апошняй тройкі папоўз сам. Ракеты ўспыхвалі далёка, але ён выразна чуў, што яны шыпелі, як апушчаны ў ваду распалены шомпал.* ***Азірнуўся – паўзлі.*** (Тамсама). Параўн.: *Лагуцін азірнуўся – за ім паўзлі байцы.* 3. *А калі мне давялося наведаць майстэрню Лёніка Тарасевіча, успомнілася старажытная кітайская прыказка, як мастак пайшоў у лес маляваць малпу. А праз месяц запытаўся ў падарожнага, што той бачыць на малюнку.* ***Адказаў–малпу*** ("ЛіМ"). Параўн.: *Падарожны адказаў: бачу малпу.*

Нельга не заўважыць, што ў такіх бяззлучнікавых складаных сказах выразна праяўляецца "эффект разговорности" [2, 149]. Несумненна, што выключную ролю ў разуменні гэтых канструкцый адыгрывае кантэкстуальнае акружэнне. Па-за канкрэтнай моўнай сітуацыяй яны не ўспрымаюцца ў якасці паўнацэннай камунікатыўнай адзінкі.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы, у складзе якіх аб'ядноўваюцца больш за дзесяць састаўных частак, ужываюцца рэдкасна, нават у тэкстах прыродаапісальнага характару. Такія бяззлучнікавыя канструкцыі звычайна змяшчаюць паведамленні аб пэўных з'явах і падзеях рэчаіснасці. Паколькі "форма састаўных частак і характар сінтаксічных адносін паміж імі не аказваюць пэўнага ўплыву на колькасць гэтых састаўных частак" [3, с. 327], то яна можа быць тэарэтычна неабмежаванай. Напр.: *Грыміць па карэннях цялежка, мігацяцца стракатыя верставыя слупы, мігаюцца, пахіліўшыся, абросшыя мохам хваёвыя крыжы наабапал дарогі; бягуць лясы, гаі, мяшаюцца палі, грамадзяцца горы, рассцілаюцца шырокія лугі, бліщчаць азёры, срэбрам пераліваюцца рэкі, золатам рассыпаюцца пяскі, глыбокімі зялёнымі ямамі раскідаюцца балоты...* (Я. Колас. Думкі ў дарозе).

З дапамогай бяззлучнікавых складаных канструкцый падчас стварaецца малюнак такой аб'ёмнасці, што яго можна нават уявіць, "убачыць": *Рушыўся снег, зашумела вада, раскаваліся рэкі ад лёду, хлынула вон зімавая нуда, сонца ўносіць цяпло і пагоду: шумныя песні іграюць лясы, павявае вятрок цеплаваты, белая ніва ад снежнай расы ўбіраецца ў чорныя латы* (Я. Купала. Перад вясною). *Наўкола ляжала цёмнае поле, дзе-нідзе грувасціліся адзіночныя дрэвы, дзьмуў сцюдзёны напірысты вецер: праўда, дажджу не было* (В. Быкаў. Сцюжа). *Надышло лета, стракатым дыванам укрыўшы тундру, свяціла сляпучае сонца, побач са старымі маткамі-аленіхамі бегалі аленяняткі – спраўляла баль бессмяротнасць жыцця* (Л. Арабей. Усё на зямлі). *Затравелая сцежка пад навіссю грабніку і гарэшніку крута вілася ўніз: пачынаўся малады ў ружовых стрэлках напараны хвойнік, віхор драў жоўтыя выспы пяску, калыхаў калматы высокі ялавец, бароды жорсткай, падобнай да шаўковай травы, лясной асакі* (В. Адамчык. Голас крыві брата твайго). *Уставала сонца, палымнела на ўсходзе пурпуровая зара, яе ружовыя бляскі ляжалі на ўскраях абрываў берагоў і на буграх гладка абмеценых гурбаў* (Э. Самуйлёнак. Паляўнічае шчасце). *Мінуў стракаты шумны май; павольнай хваляй ходзіць жыта, цямнее луг, сінее гай, рачулка дрэмле пад ракітай; дыміцца хмарка ў вышыні, трымцяць паветраныя плыні, раняе гукі ў цішыні зязюля – наш лясны гадзіннік* (А. Русецкі. Цішыня).

Увагі ў гэтым плане заслугоўвае і верш Я. Коласа "Палескія вобразы". Аўтар аб'ядноўвае "пад адным дахам" ланцужкі няпоўных, а таксама развітых і неразвітых экзістэнцыяльных (быційных) сказаў як частак адзінай канструкцыі: *Цёмны бор, кусты, балоты, кучы лоз і дубняку, рэчкі, купіны, чароты, мора траў і хмызняку; мосцік, зложаны з бярвенняў брод і грэбля кожны крок, на дарозе рад карэнняў, крыж, пахілены набок; пералескі, лес, паляны, страсвецкі дуб з жарлом, хвоя-веліч на кургане з чорным буславым гняздом; гразь, пяскі, лужок зялёны, шум крынічкі з-пад карча, шэлест лісцяў нескачоны, крык у небе крумкача; вербы, груша-сіраціна, нізкарослы цёмны гай...*

У названым аб'ёмным сказе канструктыўны састаў частак, што маюць форму быційных намінатыўных і няпоўных сказаў, лексічна абмежаваны: гэтага вымагае сітуацыя – аўтару неабходна стварыць аб'ёмную пейзажную замалёўку.

Такім чынам, актыўна выкарыстоўваюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове бяззлучнікавыя складаныя сказы ў тэкстах прыродаапісальнага характару. Намі зафіксаваны кантэксты, якія складаюцца толькі з бяззлучнікавых складаных сказаў, а таксама кантэксты, дзе яны прэваліруюць. Аднак заўважым, што апісанне бяззлучнікавых складаных сказаў трэба праводзіць не супрацьпастаўляючы іх іншым сінтаксічным адзінкам, а толькі маючы на ўвазе іх сувязь і суіснаванне з іншымі сінтаксічнымі структурамі.

**Літаратура**

1. Синтаксис современного русского языка: учебник для филологических специальностей университетов СНГ / Г. Н. Акимова, С. В. Вяткина, В. П. Казаков, Д. В. Руднев; под ред. С. В. Вяткиной. СПб.: Факультет филологии и искусств СПбГУ, 2008. – 347 с.
2. Ширяев, Е. Н. Бессоюзное сложное предложение в современном русском языке / Е.Н. Ширяев. – М.: Наука, 1986. – 224 с.
3. Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Сінтаксіс. – Мінск: Вучэбна-педаг. выд-ва МА БССР, 1959. – 378 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина